асабліва сярод сельскага насельніцтва, толькі з некаторымі заменамі: у А. разам з жанчынамі ходзяць мужчыны і незамужнія дзяўчаты, з сабой звычайна прыносяць падарункі дзіцяці і парадзісе кветкі і інш. *Т. І. Кухаронак.*

**АДЗІ́Н.** У фальклоры ўяўленні беларусаў пра лік «А.» складныя і супярэчлівыя; ён фактычна ўвабраў у сябе тры лікавыя намінацыі: «нуль», «адзін», «два». «Тры-адзінства» адзінкі найхутчэй тлумачыцца тым, што яна стаяла каля вытокаў стварэння Свету. Спачатку была прастора цемры — нуль. Пасля Бог стварыў зямлю і неба, Сонца і Месяц, якія не мелі сваёй самастойнасці, не маглі існаваць адно без аднаго. Толькі два паасобныя свяцілы ўтварылі адзінае цэлае. На гэтай касмалагічнай ідэі трымалася практыка ўнутрысямейных зносін: «Гумно плача без гаспадара, хата без гаспадыні». Негатыўнае стаўленне да паасобнага існавання падмацоўвалася ў нар. свядомасці не толькі філасофскімі разважаннямі («Адным сэрцам свету не запаліш»), але і практычным вопытам: у сферы сацыяльных адносін («Адзін, як колік у плоце»), у лячэбнай практыцы нар. медыцыны (наведаць лекара адзін раз лічылася недастатковым, каб дасягнуць станоўчых вынікаў), у гаспадарчай дзейнасці («Адным канём усё поле не аб'едзеш»), у паўсядзённым побыце («Адна галавешка не гарыць, а толькі тлее»), «Адна бяда не ходзіць, за сабой другую водзіць»). Парадокс асэнсавання ліку «А.» ўскладняўся тым, што сам па сабе ён меўся на ўвазе, улічваўся, але не ўспрымаўся базавым элементам у сістэме натуральных лікаў. Калі ён стаяў па-за кантэкстам нейкай агульнасці, шэрагу іншага, то адпавядаў нулю: «Адзін у полі не воін». Зусім іншы статус набываў А. тады, калі распачынаў адлік часу, засваенне прасторы, калі стаяў у шэрагу падобных з'яў, калі пачынаў канцэнтраваць вакол сябе мноства падобнага. У гэтым выпадку ён набываў статус *першага* і атаясамліваўся са з'явай сакральна-магічнай выключнасці. Аднлачасова А. сімвалізаваў паяднанасць, адзінства, агульнасць падыходаў. Пра дружную сям'ю казалі: «Адным возам па піва едуць», а пра моцную дружбу сяброў: «Яны ў адзін дух гавораць». Драматызм існавання адзінкі надзвычай эмацыянальна адлюстраваны ў жніўнай паэзіі і пахавальна-памінальных галашэннях. Смерць мужа, гаспадара, бацькі балюча адбівалася на далейшым лёсе сям'і, жонкі, дзяцей. Той, хто застаўся А., без пары, не здолее далей весці гаспадарку. Непаўнавартнаснасць ліку «А.» і адмоўнае стаўленне да яго сустракаецца ў прыказках тыпу «на ўсё сяло адзін вол — і той гол», «Не адзін у Полацку Гаўрыла». Прынцып абрадавай невыразнасці, стрыманасці ацэнкі, парушанай гармоніі суладдзя, агульнасці паспрыяў негатыўнаму стаўленню да шматлікіх фактаў пачатковай фазы ў вымярэнні часу: «Панядзелак — цяжкі дзень» (таму што першы ў ліку іншых). А. атрымаў глыбокае філасофска-псіхалагічнае і маральна-этычнае асэнсаванне. Праз парушэнне Богам дадзеных законаў грамадскага суіснавання адзінка выключаецца (выпадае, праганяецца, пазбаўляецца ўключнасці ў грамаду) з цэласнага адзінства і, трапляючы ў сітуацыю адзіноты, фактычна асуджана на смерць. Гэта ідэя шматразова вар'іруецца, але заўсёды з адным і тым самым вынікам, у чарадзейных казках пра птушак і прадстаўнікоў хтанічнага свету (гадзюк, вужакаў). Падстрэленая птушка адстае ад чарады і застаецца ў родных мясцінах на зіму, але яна не здольна выжыць у нязвыклых для яе ўмовах. У дзень Узвіжання (27 верасня) усе паўзучыя пачвары збіраюцца ў гурты (раі) і адпраўляюцца ў вырай (на той свет) — на зімовы спачын. Тая ж гадзюка, якая парушыла закон гарманічнага суіснавання і ўкусіла чалавека, не прымаецца ў гурт і вымушана застацца на зіму ў гэтым свеце. Той, хто парушыў закон суіснавання, г.зн. паставіў сябе па-за межамі існуючых адносін, надзяліў сябе рысамі процістаяння, выключнасці ў шэрагу падобных, аказваецца ў такіх умовах, у якіх выжыць немагчыма. У адным з нар. мудраслоўяў робіцца неабвержная выснова: «Без грамады — як адзінокі журавель перад Пакровамі». *І. І. Крук.*

**АДКЛЯ́ЦЦІ**, гл. *Ахоўныя слоўныя формулы.*

**АДНАГАЛО́ССЕ**, адзін з распаўсюджаных складаў бел. нар. музыкі (манодыя); меладычны склад, калі ў музычным фалькл. творы пануе толькі адна мелодыя. У адрозненне ад гарманічнага складу фалькл. музыкі (*шматга-*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*лоссе*) у А. не ўтвараецца адначасова спалучэння гукаў. А. выконваецца звычайна адным спеваком або музыкантам-інструменталістам, а часам таксама некалькімі ва унісон (унісонная гамафонія). Бел. абрадавыя песні, як правіла, аднагалосыя. Меладычны пачатак А. заснаваны на мелодыі, якой уласціва лінеарнасць — паслядоўная змена вышыні гукаў, у выніку чаго ўтвараецца напеў. А. распаўсюджана пераважна на поўначы Беларусі, у Паазер'і. Як старажытная традыцыя А. тут захавалася найбольш поўна ў адзіночных або сумесных спевах ва унісон. Паводле характару А. нар. песень Паазер'я спакойнае, роўнае, напеў у іх разгортваецца павольна, дасягаючы свабоды і шырыні. А. каляндарных і сямейна-абрадавых песень Паазер'я разнастайнае па рытміцы і кампазіцыйнай будове. А. ўласцівы таксама элементы арнаментальнай мелодыкі, якія ўтвараюць своеасаблівы строй бел. нар. музыкі. А. абрадавых песень трэба беражліва ахоўваць, бо А. гэтых твораў можна сапсаваць іх апрацоўкамі, парушыць спецыфіку і характар. Выкананне аднагалосых мелодый традыцыйнай спадчыны дазваляе закаваць яе ў спрадвечнай чысціні.

*Літ.:* Мажэйка З.Я. Песні беларускага Паазер'я. Мн., 1982; Аляхновіч А.М. Народная песня ў школе. Мн., 2004. С. 37—38.

*А.М. Аляхновіч.*

**АДРАДЖЭННЕ**, Рэнесанс (франц. Renaissance), у гістарыяграфічным значэнні — эпоха ў развіцці культуры Еўропы, пераходны перыяд ад сярэдневякоўся да Новага часу (14 — 1-я палавіна 17 ст.). Характарызуецца ўздымам савецкай навукі, мастацтва, станаўленнем нац. мовы, літаратуры і нац. самасвядомасці, гуманістычным светапоглядам. У больш шырокім грамадска-палітычным значэнні — заканамернасць у гістарычным развіцці народаў і рэгіёнаў, якая выяўляецца ў паскораным руху эканамічных, палітычных і творча-культурных працэсаў да больш высокіх форм грамадскага быцця, нац. самасвядомасці і нац. культуры, пасля працяглых перыядаў застою або ўпадку. А. ў значэнні культурна-гістарычнага тыпу характэрна для тых народаў і рэгіёнаў (пераважна Заходняй, часткова Цэнтральна-Усходняй Еўропы), гістарычныя працэсы якіх характарызуюцца плаўнасцю і паступальнасцю прагрэсіўнага развіцця. А. як уздым грамадскага быцця і культуры пасля іх заняпаду яскрава выявілася ў тых народаў (Усходняй Еўропы, славяна-балцкіх, азіяцкіх рэгіёнаў), гістарычныя працэсы якіх характарызаваліся перапыннасцю і катастрафічнасцю. У метадалагічным плане першы тып А. варта абазначаць як гуманістычнае, другі тып — нацыянальнае А. Гэтыя тыпы ўзаемадапаўняльныя: у эпоху гуманістычнага Рэнесансу выявіліся некаторыя прыкметы нац. А. (станаўленне нац. мовы і самасвядомасці), а ў перыяды нац. А. на новым узроўні паўтараюцца рысы гуманістычнага Рэнесансу (паскоранае развіццё свецкай культуры, творчая шматграннасць палітычных дзеячаў, навукоўцаў, пісьменнікаў).

Першыя пісьмовыя звесткі пра бел. фальклор — пераказы паданняў і легендаў, упамінанне фалькл. герояў, прыказак і прымавак захаваліся ў летапісах і хроніках 15—17 ст., дакументах і ў дзяржаўнай перапісцы. Прадмову да біблейскай кнігі «Эсфір» (1519) Ф.Скарына закончыў вершаваным двухрадкоўем у форме нар. выслоўя:

> Не копай под другом своим ямы,
>   сам ввалишся в ню.
> Не став, Амане, Мардохею шибенице,
>   сам повиснеш на ней.

У прадмове да «Кнігі прытчаў» (1517) пачынальнік бел. гуманістычнага А. звярнуў увагу на падтэкст біблейскіх выслоўяў, аналагічных па структуры з прыказкамі і прымаўкамі, бо яны «иную мудрость знаменують а иначей разумеють, нежели молвены бывають, и болши в собе сокритых тайн замыкають, нежели ся словами пишуть». Ваенны дзеяч ВКЛ Ф.Кміта-Чарнабыльскі ў лістах-данясеннях ураду (1573—74) шырока карыстаўся фальклорна-бытавой фразеалогіяй, вобразнымі прыказкамі і прымаўкамі («Коли топили, топор давали, а выплывши — ни топорища», «Ожехшися на молоце, велено на воду дуть», «И каши не хочу, и по воду не иду» і інш.), дзякуючы якім яго лісты набылі літаратурную каштоўнасць. Польскі і бел. паэт новалацінскай школы С.Рысінскі (1560—1625) упершыню сабраў і апублікаваў у Любчы зборнік «Тысяча восемсот польскіх прыказак» (1618), куды ўключыў творы гэтага жанру з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ